

Памер мае значэнне

СТАР. 2



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Выпрабаванне эміграцыяй

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

11 КРАСАВІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 67 (27677) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# САПРАЎДНАЕ ПІВА ПАХНЕ ХЛЕБАМ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб стане і перспектывах развіцця піваварнай галіны раскрытыкаваў яе за здачу пазіцый**

**Прэзідэнт нагадаў, што мінулы раз адпаведныя пытанні абмяркоўваліся прыкладна сем гадоў таму, паведамляе БЕЛТА. Тады былі прыняты рашэнні аб буйнамаштабным тэхнічным перааснашчэнні піваварных заводаў, правілах уваходжання на беларускі рынак вядучых сусветных піваварных кампаній. На мадэрнізацыю галіны было выдаткавана $300 млн, у тым ліку $30 млн бюджэтных сродкаў, $160 млн — уласных сродкаў як дзяржаўных, так і прыватных кампаній, былі прыцягнуты значныя крэдытныя рэсурсы беларускіх і замежных банкаў. «Мы абсталявалі прадпрыемствы высокатэхналагічным абсталяваннем сусветных кампаній», — адзначыў беларускі лідар.**

У выніку вытворчыя магутнасці павялічаны практычна да 70 млн дэкалітраў піва за год, чаго дастаткова для забеспячэння патрэб унутранага рынку і паставак гэтай прадукцыі на экспарт. У краіне штогод нарыхтоўваецца больш за 150 тысяч тон піваварнага ячменю, якога павінна хапаць для забеспячэння ўласнай вытворчасці і экспарту. Але сёння, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэта галіна «не проста кульгае, а знішчаецца».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на 80% айчынная піваварная галіна, якая павінна быць высокадаходнай, была распрададзена і прыватызавана, а ў руках дзяржавы засталося толькі 20%. Прэзідэнт прывёў звесткі статыстыкі, што створаныя вытворчыя магутнасці выкарыстоўваюцца толькі на 60%, а на працягу апошніх трох гадоў аб'ём вытворчасці піва ў Беларусі скарачаецца, а імпарт расце. «Ні ў адной краіне пры развіцці ўласнай вытворчасці няма такога імпарту — 30%, — падкрэсліў беларускі лідар. — Чаму замежным вытворцам выгадна вазіць яго за тысячы кіламетраў, а нашы кампаніі, як дзяржаўныя, так і прыватныя, у сябе дома губляюць рынак?»

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на невыкананні планаў урада па імпартазамяшчэнні. Большасць піваварных арганізацый, і дзяржаўных, і прыватных, на працягу апошніх трох гадоў церпіць страты. Прэзідэнт прызнаў, што на фоне агульнай карціны ёсць адзінкавыя прыклады піваварных прадпрыемстваў, якія актыўна развіваюцца, працуюць прыбыткова, з высокай загрузкай магутнасцяў, і нарошчваюць вытворчасць. «Гэта сведчыць аб тым, што магчымасці для эфектыўнай працы на рынку ёсць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У выпадку неэфектыўнай працы прыватных піваварных кампаній яны будуць вернутыя пад кантроль дзяржавы, заявіў Прэзідэнт, адзначыўшы, што ў свой час пры допуску замежных вытворцаў на беларускі піўны рынак вызначалася, што інвестары будуць займацца развіццём сыравінных зон, пашырэннем асноўнай вытворчасці, імпартазамяшчэннем і нарошчваннем экспарту. «У 2015 годзе вы мне далажыце аб выніках працы, і калі хоць адно прадпрыемства будзе нізкарэнтабельным або стратным, асабліва з ліку прыватызаваных, яны неадкладна, як «Камунарка» і «Спартак», будуць вернуты ва ўласнасць дзяржавы, — заявіў беларускі лідар. — Калі і не вернуты, то будуць узятыя жалезна пад кантроль і кіраванне дзяржавы».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, па заявах дасведчаных спецыялістаў і людзей, якія ўжываюць піва, імпартная прадукцыя нашпігаваная рознага роду смакавымі дабаўкамі і кансервантамі. «Беларускае піва — натуральнае», — упэўнены кіраўнік дзяржавы. У пацвярджэнне Прэзідэнт распавёў, што можна правесці просты эксперымент, каб асабіста ў гэтым пераканацца: «Калі ідзяце ў лазню, вазьміце імпартнае піва і айчыннае — як у нас было прынята, пырснуць на камяні — і панюхайце, чым гэта ўсё пахне. Беларускае піва — гэта пах хлеба. Гэта ўсё жывое і натуральнае».

# ТВОРЧАСЦЬ — ЭКАЛОГІЯ ДУШЫ



Фота Анатоля КЛЕШУКА.

**Жыхар хутара Стойлы Мікалай Тарасюк, народны майстар Беларусі, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва, герой некалькіх дакументальных фільмаў і фотаальбома «Сялянская энцыклапедыя», не зважае на свой салідны ўзрост і працягвае ствараць па-ранейшаму цікавыя кампазіцыі, чым пацвярджае аксіёму: творчасці ўзрост не перашкода. Ёсць натхненне — будзе і творчасць! Адкуль у 82-гадовага вяскоўца бярэцца натхненне? Гэтую загадку не разгадае ніхто, і нават сам мастак-разьбяр не здольны даць адказ. Што па-добраму здзіўляе, ён нават не паклапаціўся падлічыць, колькі драўляных фігурак зрабіў. Хай сабе не за ўсё жыццё, а толькі для твораў, якія змешчаны ў драўлянай пабудове ў яблыневым садзе — музеі-галерэі. Сто, тысячу, дзве тысячы?..**

СТАР. 6

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы**

*«Радуе тое, што цяпер айчынныя тураператары прадастаўляюць усё больш магчымасцяў для экскурсійнага і пазнавальнага адпачынку, які арыентаваны на ўнікальныя прыродныя комплексы і багатую гісторыю нашай краіны. Разам з тым, турыстычны бізнес усё яшчэ не надае належнай увагі развіццю спартыўнай інфраструктуры. Гасцінічны комплекс павінен прапаноўваць турыстам магчымасць актыўнага адпачынку, а побач з алкагольным барам, напрыклад, было б няблага размясціць фіта-бар для тых, хто вядзе здаровы лад жыцця. У адпачывальніка, як мінімум, павінна быць магчымасць выбару, як правесці час. Напрыклад, не лішнім будзе ўключыць спартзалу, веласіпедную або пешаходную прагулку, партыю ў тэніс, гульню ў бадмінтон ці валейбол».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.04.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9920,00 | ■ |
| Еўра | 13750,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 279,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 816,46 | ▼ |

■ Парламенцкі дзённік

# Дзяржрэгістрацыя лекавых сродкаў будзе спрошчана

**А сума штрафаў за парушэнне правілаў дарожнага руху стане фіксаванай**

**На чарговым пасяджэнні чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання дэпутаты разгледзелі 19 законапраектаў, якія тычацца самых розных сфер жыцця грамадства, і адзін праект пастановы Палаты прадстаўнікоў.**

### АДНОЛЬКАВАЯ ДАСТУПНАСЦЬ

У першым чытанні быў прыняты праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб лекавых сродках». У ім прапанавана абнавіць і дапоўніць паняційны апарат, а таксама ўнесці змены, якія прадугледжваюць спрашчэнне адміністратыўнай працэдуры дзяржаўнай рэгістрацыі лекавых сродкаў. **Васіль ЖАРКО, міністр аховы здароўя,** паведаміў, што праект закона прадугледжвае рознічную рэалізацыю лекавых сродкаў па-за аптэкамі — падчас правядзення міжнародных спартыўных спаборніцтваў, а таксама культурна-масавых мерапрыемстваў.

СТАР. 2

■ Здымнае жыллё



Фота Анатоля КЛЕШУКА.

# АЖЫЯТАЖУ НЕ ЧАКАЕЦЦА?

**Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць, што значнага павелічэння попыту на здымнае жыллё падчас ЧМ па хакеі не будзе**

**Ужо чацвёрты месяц запар на мінскім рынку жыллёвай нерухомасці назіраецца сапраўдны «мёртвы» сезон, калі колькасць здзелак куплі-продажу кватэр паменшылася ў разы. Гэтая акалічнасць пэўным чынам адгукнулася і на сітуацыі з арэндай прыватнага жылля. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.**

## Існуе выбар нават сярод бюджэтных кватэр

Цяпер сітуацыя істотна змянілася, бо з рынку знікла вялікая колькасць менавіта нервовых кліентаў, якім арэндныя кватэры неабходна было знайсці амаль імгненна. Сёння попыт крыху паменшыўся і адначасова сур'ёзна павялічылася прапанова даволі якасных жылых памяшканняў. Адкуль яны «зваліліся»? Усё тлумачыцца рынкам куплі-продажу кватэр, які знаходзіцца ўжо ў працяглым «завісанні». У каталогах на продаж цяпер знаходзіцца іх бадай максімальная колькасць (каля 7,5 тысячы аб'ектаў). Разам з тым, калі кватэры больш за два месяцы не знаходзяць сабе новых уласнікаў, то яны амаль аўтаматычна трапляюць у разрад арэнднага жылля. Людзі здаюць такую нерухомасць на непрацяглы час, таму і цэннік на іх ніжэйшы за рынкавы. А пры вялікай прапанове падобных кватэр пачынае зніжацца агульны «тарыф» арэнды і па ўсіх сегментах здымнага жылля.

**Калі кватэры больш за два месяцы не знаходзяць сабе новых уласнікаў, то яны амаль аўтаматычна трапляюць у разрад арэнднага жылля.**

Так здарылася, што цяпер на рынку першую скрыпку іграюць менавіта патэнцыяльныя кватаранты. Выбар у іх сёння максімальны па ўсіх катэгорыях жылля. Так, у каталог прапановы агенцтва нашага эксперта за дзень трапляе часам да некалькіх дзясяткаў свежых кватэр, сярод якіх хапае і бюджэтных.

СТАР. 2

■ Надвор'е

# ЦЯПЛО НЕ СПЯШАЕЦЦА

**Уначы на суботу чакаюцца замаразкі да мінус 2**

**Сёння тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў халодных паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку Паўночнай Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Пры павышаным фоне атмасфернага ціску ападкаў амаль не будзе, толькі месцамі ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях магчымы невялікі дождж. Тэмпература паветра ўдзень ад 8 да 13 цяпла. У выхадныя атмасферны ціск пачне зніжацца і пад уплывам вільготных паветраных мас месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы на суботу будзе 0 — плюс 5 градусаў, пры праясненнях — да мінус 2 градусаў. Удзень стане больш камфортна — 7-13 цяпла, а па захадзе Брэсцкай вобласці — нават да плюс 15 градусаў. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю будзе 1-6 цяпла, удзень — плюс 10-17 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак і аўторак з боку Балтыйскага мора да нас завітаюць атмасферныя франты. Таму паўсюдна пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ўначы 2-7 цяпла, удзень — плюс 8-14, а па поўдні Беларусі чакаецца да 16 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯНЕ НЕ СУПРАЦЬ ПАРАДНІЦЦА З УКРАІНЦАМІ



Усерасійскі цэнтр вывучэння грамадскай думкі прадставіў звесткі аб тым, што адчуваюць расіяне ў дачыненні да жыхароў Украіны. Так, паводле апытання, кожны пяты рэспандэнт адчувае да жыхароў Украіны сімпатыю (21%) і павагу (20%). Аднак у 18% апытаных яны выклікаюць расчараванне, а асуджаюць суседзяў 12%. Прыняць у сваю сям'ю выхадцаў з Украіны гатовыя 70% расіян. Так думаюць як рэспандэнты, якія наведалі Украіну (72%), так і тыя, хто ніколі там не быў (68%). У сваю чаргу, 19% апытаных не хацелі б мець падобных сваякоў. Пры гэтым хоць бы раз у жыцці Украіну давялося наведаць 45% расіян. Раней цэнтр апублікаваў вынікі іншага апытання, якое паказала, што больш за 90% грамадзян Расіі лічаць правільным рашэнне аб прыняцці Крыма ў склад Расіі.

### ПАСЕ АБМЕЖАВАЛА ПАЎНАМОЦТВЫ РАСІІ

У чацвер на пасяджэнні Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) расійскую дэлегацыю пазбавілі права прымаць да канца года ўдзел у галасаваннях, а таксама ўвялі яшчэ шэраг санкцый. У рэзалюцыі ПАСЕ дзеянні Расіі названыя «анексіяй Крыма» і «ўзброенай акупацыяй» украінскай тэрыторыі. Маскву абвінавацілі ў пагрозе выкарыстання ваеннай сілы і прызнанні вынікаў «незаконна праведзенага так званага рэферэндуму». Асамблея мяркуе, што Расія паставіла пад пагрозу стабільнасць і мір у Еўропе. Дэлегацыя Расіі пасля гэтага датэрмінова пакінула сесію.

### ЯСТРАБ БУДЗЕ АБАРАНЯЦЬ ГАЛУБОЎ ПАПЫ РЫМСКАГА

Швейцарская гвардыя, якая служыць у Рыме на варце Святога Прастола, займела спецыяльна натрэніраваную драпежніцу па мянушцы Сільвія для абароны галубоў міру ад нападу драпежных птушак. Ястраб прайшоў спецыяльны курс навучання на поўначы Італіі. У Ватыкане спадзяюцца, што птушцы ўдасца абараніць папскіх галубоў, якіх традыцыйна выпускаюць у Ватыкане, ад нападаў іншых крылатых драпежнікаў. 26 студзеня, пасля традыцыйнай нядзельнай пропаведзі, Папа Францыск на вачах шматтысячнага натоўпу выпусціў у неба галубоў, якія далёка не паляцелі, таму што іх задзяўблі чайкі і вароны.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ РАЗБУРАЮЦЬ АДНОСІНЫ

Сеткі звязаны з эмацыйнай і фізічнай здрадай, разрывамі адносін, паказала новае даследаванне. Прычым працягласць рамантычных стасункаў не адыгрывае ніякай ролі, заяўляе Расэл Клэйтан з Універсітэта Місуры. Клэйтан даследаваў 581 карыстальніка Twitter розных узростаў. Людзей апытвалі на прадмет актыўнасці карыстання сацыяльнай сеткай. Таксама навуковец цікавіўся, ці былі канфлікты з партнёрам, звязаныя з выкарыстаннем Twitter. Высветлілася: чым часцей сваю актыўнасць чалавек праяўляў у Twitter, тым большай была рызыка канфлікту з партнёрам. Раней Клэйтан праводзіў падобнае даследаванне Facebook. Тады было даказана: частата выкарыстання сацыяльнай сеткі прадказвала наяўнасць звязаных з ёй канфліктаў, якія прыводзілі да разводу і расставання. У любым выпадку, навуковец раіць скараціць час карыстання сацыяльнай сеткай, калі маюцца праблемы ў асабістым жыцці. Справа ў тым, што людзі, якія занадта актыўна карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі, могуць ухіляцца ад зносін з партнёрам, а гэта, зразумела, суправаджаецца ростам недаверу.



КОРАТКА

Усе заробленыя на рэспубліканскім суботніку сродкі ў гэтым годзе пойдуць на стварэнне цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава. Аб гэтым на пасяджэнні рабочай групы па падрыхтоўцы суботніка паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік.

У Беларусі пражываюць амаль 29 тыс. былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання. Сярод рэгіёнаў рэспублікі больш за ўсё былых вязняў на 1 студзеня гэтага года налічвалася ў Віцебскай вобласці (6 тыс. 767 чалавек), менш за ўсё — у Гродзенскай вобласці (1 тыс. 786).

Урад растлумачыў асобныя пытанні спагнання ўтылізацыйнага збору ў Беларусі. Так, пры градацыі транспартных сродкаў фармулёўкі «ад» і «да» трэба атаясамліваць з фармулёўкамі «звыш» і «не больш за» адпаведна. Напрыклад, транспартны сродак з рабочым аб'ёмам рухавіка роўна 2 тыс. куб. см трэба адносіць да групы ад 1 тыс. да 2 тыс. куб. см.

У хакейным клубе «Дынама-Мінск» уведзена новая кіруючая пасада — генеральны менеджар. На яе назначаны Уладзімір Беражкоў.

■ Ёсць праблема

# ДАСТАЦЬ ГРОШЫ З УПАКОЎКІ

**«Тэтрапак» — адходы з «перспектывай»**

**Другаснай пераапрацоўкай паперы, шкла ці пластыку сёння нікога не здзівіць — ёсць спецыяльныя кантэйнеры, пункты прыёму. А вось папулярная ўпакоўка Tetra Pak, у якой прадаюцца малочная прадукцыя, сокі, віно, не мае спецыяльных месцаў утылізацыі. Ці магчыма даць другое жыццё Tetra Pak і што ў гэтым кірунку сёння робіцца ў краіне? Пра перспектывы з'яўлення спецыяльнага прадпрыемства гутарылі супрацоўнік па хімічнай бяспецы і адходах Цэнтра экалагічных рашэнняў Анатоль Калач, галоўны інжынер КУП «Экарэс» Аляксандр Жукавец, прадстаўнікі кампаніі Tetra Pak у Беларусі Віктар Маскалёў і Аляксандр Барсукоў, спецыяліст дзяржаўнага прадпрыемства «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Вольга Волкава.**



### УПАКОЎКА-БУТЭРБРОД

Tetra Pak — упакоўка трохслойная: кардон, алюміній у выглядзе фольгі і поліэтылен. Складанасць пераапрацоўкі заключаецца ў раздзяленні гэтых пластоў, бо, па сутнасці, кожны з матэрыялаў з'яўляецца другасным матэрыяльным рэсурсам. На выхадзе атрымліваюцца два віды сыравіны — цэлюлознае валакно і поліалюміній. Першая ідзе для вытворчасці кардону і паперы, другая — на гаспадарчыя скрыні і ёмістасці. Па гэтай схеме працуюць у Еўропе і СНД. Аднак у Беларусі месцаў для пераапрацоўкі такога тыпу ўпакоўкі няма. «Адзінае рашэнне для спажыўца — зменшыць аб'ём упакоўкі, папросту сціснуўшы яе перад тым, як выкінуць у кантэйнер», — заўважыў Анатоль Калач. Нават калі выкідваць Tetra Pak у кантэйнеры для макулатуры, на сартавальнай станцыі іх усё роўна адбяруць і завязуць на палігон з іншым смеццем, гэта пацвердзіў Аляксандр Жукавец.

СТАР. 2

# Дзяржрэгістрацыя лекавых сродкаў будзе спрошчана

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Алена ШАМАЛЬ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы,** у размове з журналістамі заўважыла: «Фармакалагічная прамысловасць — вельмі дынамічная сфера. Штогод з'яўляецца не адзін дзясятак новых лекавых сродкаў». Адпаведнае заканадаўства не павінна адставаць ад развіцця лекавай індустрыі. «Асноўная мэта законапраекта — бяспека лекавых сродкаў і цэнавая палітыка, — патлумачыла Алена Шамаль. — Апошняя заснавана на тым, што ўсе грамадзяне павінны мець аднолькавую магчымасць набываць лекавыя сродкі».

У законапраекце ўводзіцца такое паняцце, як «адпускная цана». Так, сёння ў многіх аптэках адзін і той жа лекавы сродак можа каштаваць па-рознаму. Мэта законапраекта — забяспечыць адзіную цэнавую палітыку пры закупцы лекаў, пры іх уваходжанні на беларускі рынак, а таксама разгледзіць магчымасць увядзення адзінай палітыкі па нацэнках у рознічным і аптовым гандлі. Парламентарый упэўнена, што гэта дазволіць знізіць цэны на лекавыя прэпараты і, як вынік, павялічыцца ўзровень даступнасці лекавых прэпаратаў розных вытворцаў.

## ВІНАВАТЫ БЕЗ СУДА?

Дэпутаты — абраннікі народа, і адной з асноўных функцый іх з'яўляецца абарона інтарэсаў свайго электарату. У Пастаянную камісію па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў паступіў зварот грамадзянкі, якая была не згодна з рашэннем суда. У 2007 годзе сын жанчыны загінуў у аўтамабільнай аварыі, разам з ім загінуў пасажыр. У аварыі абвінавацілі сына грамадзянкі, хоць суда і не было.

Жанчына вывучыла заканадаўства і знайшла неадпаведнасць паміж артыкуламі Крымінальна-працэсуальнага кодэкса і Канстытуцыяй Беларусі. Так, згодна з асноўным законам краіны, канчаткова вызначыць, вінаваты ці не вінаваты чалавек, можа толькі суд. Але часта, калі адзін чалавек мёртвы, справа закрываецца без суда. Ды і хто абароніць інтарэсы чалавека, які памёр? Ёсць верагоднасць і таго, што сапраўдны віноўнік так і застанецца непакараным, калі адказнасць будзе ўскладзена на памерлага. А родным, якія і так страцілі блізкага чалавека, прыходзіцца мірыцца яшчэ і з тым, што яго назвалі вінаватым.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Людміла МІХАЛЬКОВА** падтрымала ініцыятыву грамадзянкі і прапанавала дэпутатам прыняць праект пастановы Палаты прадстаўнікоў, які тычыцца звароту ў Канстытуцыйны суд з прапановай даць заключэнне аб адпаведнасці вызначаных артыкулаў Крымінальна-працэсуальнага кодэкса. Нагадаем, пакуль грамадзяне нашай краіны не могуць напрамую звяртацца ў Канстытуцыйны Суд, аднак на нядаўняй сустрэчы Прэзідэнта краіны з суддзямі Канстытуцыйнага Суда такая магчымасць абмяркоўвалася.

## «ПАДМУРКІ» ДЛЯ ЎСТУПЛЕННЯ Ў СГА

Сярод законапраектаў, вынесеных на абмеркаванне, ёсць два, якія тычацца ратыфікацыі пагадненняў паміж урадам нашай краіны і ўрадамі краін далёкага замежжа — Балівіі і Шры-Ланкі — аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. **Адам ВАШКОЎ, дэпутат Пастаяннай камісіі па міжнародных справах,** падкрэсліў, што такія дакументы маюць важнае значэнне для дзяржавы. «Мы імкнёмся ўступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю, але там ёсць свае правілы, — адзначыў парламентарый. — З-за ўступлення Расіі ў гэтую арганізацыю рынак Мытнага саюза «прасеў», асабліва ў машынабудаўнічай сферы. Гэта стала ўдарам па эканоміцы і нашай краіны».

Прыняцце такіх законапраектаў пашырыць магчымасці збыту прадукцыі буйных прадпрыемстваў. Як заўважыў парламентарый, такога кшталту двухбаковыя пагадненні — а іх наша краіна заключыла ўжо больш чым з 70 дзяржавамі — даюць магчымасць падрыхтаваць беларускую эканоміку да як мага менш праблемнага ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Таксама, калі казаць пра законапраекты, звязаныя з міжнароднай сферай, то дэпутаты ратыфікавалі пагадненні нашай краіны з Манголіяй аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе ў мытных справах, аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве і аб адмене віз. Дадаткова дэпутаты прагаласавалі за наданне юрыдычнай сілы пагадненням аб адмене віз для ўладальнікаў дыпламатычных, службовых і афіцыйных пашпартоў з Балівіяй і Шры-Ланкай.

## ВЕДАЙ СВОЙ ШТРАФ

Госці краіны ў цэлым адзываюцца добра пра беларусаў, але, на жаль, гэта не тычыцца нашай культуры паводзін на дарогах. Законапраект «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях забеспячэння бяспекі дарожнага руху» мае на мэце замацаваць магчымасць прыцягнення да адказнасці кіроўцаў за парушэнне правілаў спынення і стаянкі транспартных сродкаў на падставе паказанняў спецыяльных тэхнічных сродкаў, што працуюць у аўтаматычным рэжыме.

**Станіслаў КУЛЕШ, дэпутат Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі,** звярнуў увагу на тое, што асноўныя напрамкі дакумента — правілы паркоўкі і выкананне хуткаснага рэжыму. «Прыняцце законапраекта надасць яснасць: у ім вызначаны канкрэтныя сумы штрафаў і тое, што ўладальніка будуць папярэджваць, куды адбуксавалі яго машыну», — расказаў дэпутат.

Што да штрафаў, то пры перавышэнні хуткасці на 10-20 км за гадзіну кіроўца заплаціць палову базавай велічыні, на 20-30 км за гадзіну — 2 базавыя велічыні, на 30-40 — 4 базавыя, калі перавышэнне хуткасці акажацца звыш 40 км/г, штраф складзе 6 базавых велічынь.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# АЖЫЯТАЖУ НЕ ЧАКАЕЦЦА?

## З'явіліся аднапакаёўкі і за 300 долараў

Максімальны аб'ём прапановы прымусіў уладальнікаў свабодных кватэр сур'ёзна паменшыць свае апетыты. Толькі за апошнія два месяцы сярэдні кошт арэнды стандартных кватэр паменшыўся на 50-80 долараў. Цяпер мінімальны цэннік аднапакаёвых кватэр складае ўсяго 300-350 долараў. А яшчэ ў сярэдзіне студзеня падобныя аднапакаёўкі па 380-400 долараў трэба было яшчэ адшукаць. Існуюць на рынку маленькія кватэры побач з метро і за 400-450 долараў, але на іх кліенты амаль не звяртаюць увагі. Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр цяпер складае толькі 400-420 долараў. У рэдкіх выпадках больш якасныя двухпакаёўкі прапануюцца па 450-480. Нават стандартныя трохпакаёвыя кватэры гэтымі днямі можна знайсці за 450-500, а такія памяшканні без мэблі — за 420-450 долараў.

**Сярэдні цэннік арэнды даволі прыгожай, але без «навакротаў», дачы пад Мінскам складае ад 200 да 300 долараў за месяц.**

## Да восені падаражання не прадбачыцца

Эксперты сталічнага рынку арэнды ўпэўнены, што напярэдадні і падчас ЧС па хакеі цэннікі па доўгатэрміновай арэндзе павялічвацца не будуць. Попыт на такое прыватнае жыллё з боку будучых наведвальнікаў сусветнага першынства цяпер мінімальны. Пакуль што агенцтва «ПАКАДАН» не атрымала ніводнай заявы на арэнду кватэр з боку спартыўных турыстаў. Магчыма, гэта тлумачыцца своечасовым увядзеннем у эксплуатацыю ў сталіцы вялікай колькасці сучасных гасцініц. Напярэдадні хакейнага мундыяля плануецца выдзяленне жылых пакояў і блокаў у інтэрнатах і іншыя мерапрыемствы. Да таго ж аматары спартыўнага форуму будуць больш звяртаць увагу на кватэры «на суткі», а не на рынак доўгатэрміновай арэнды.

Больш за тое, існуюць перадумовы нават далейшага патаннення гэтага сектара паслуг. Тут маецца на ўвазе той факт, што ўжо ў маі на рынак арэнды трапіць дастатковая колькасць сезонных кватэр ад бабуль, якія будуць жыць у сваіх садовых доміках ажно да восені. Праўда, існуе адно «але». Як толькі пачнецца павелічэнне колькасці здзелак па сегменце куплі-продажу кватэр, то адразу скароціцца ўзровень аб'ёму прапановы на рынку прыватнай арэнды жылля. А ўслед за такім скарачэннем прапановы можа адбыцца і чарговае падаражанне здымнага жылля. Хутчэй за ўсё, такая цэнавая ракіроўка адбудзецца не раней за верасень.

**ДАРЭЧЫ**

**Спецыялістамі падлічана, што грамадзяне замежных дзяржаў маюць у Мінску ва ўласнасці каля 22 тысяч кватэр.**

**Сярод уладальнікаў такой нерухомасці лідзіруюць грамадзяне Расіі, Украіны і Германіі. Набываюць кватэры ў Мінску таксама жыхары Латвіі, ЗША, Літвы, Казахстана, Эстоніі і некаторых іншых краін.**

Апошнім часам пачалася актыўная канкурэнтная барацьба паміж уладальнікамі элітнага і дарагога жылля. Калі арэнда кватэры каштуе больш за тысячу долараў, то адшукаць на яе багатых кліентаў стала праблематычна. Таму гаспадары такіх жылых памяшканняў пачалі «заманьваць» кліентаў рознымі «фішкамі». Нехта будуе ў сваіх апартаментах экстравагантныя фантаны, іншыя арганізуюць у асобным пакойчыку спецыяльны мікраклімат за кошт экзатычных раслін і гэтак далей. Аднак самым лепшым «пернікам» для пакупніка застаюцца сур'ёзныя зніжкі. І ў гэтым кірунку «лёд крануўся».

Пацікавіліся мы ў спадарыні Лукашэвіч аб тэме магчымай актывізацыі замежнай міграцыі з боку суседніх дзяржаў. Факты такія і сапраўды ёсць. За апошні час у яе агенцтве чатыры сям'і з Украіны знялі ў Мінску ў прыватным сектары звычайныя стандартныя кватэры. Здзелкі ажыццяўляліся ў спакойным рэжыме без ніякага аўралу. Інфармацыю аб статусе мігрантаў і прычынах прыезду спецыялісты агенцтваў у будучых кватарантаў звычайна не патрабуюць. Жыццёвыя сітуацыі розныя бываюць...

**Нехта будуе ў сваіх апартаментах экстравагантныя фантаны, іншыя арганізуюць у асобным пакойчыку спецыяльны мікраклімат за кошт экзатычных раслін і гэтак далей.**

## Адпачынак на дачы

Гэтымі днямі ў агенцтвах нерухомасці з'явіліся першыя заяўкі ад кліентаў, якія жадаюць актыўна адпачываць недалёка ад галоўнага мегаполіса краіны, але, разам з тым, і на прыродзе. У каго сваёй загараднай «фазэнды» няма, то менавіта цяпер яны і пачынаюць «варушыцца». Сярэдні цэннік арэнды даволі прыгожай, але без «наваротаў», дачы пад Мінскам складае ад 200 да 300 долараў за месяц. Масавы заезд першых аматараў дачных шашлыкоў пачнецца крыху пазней — калі сапраўды пацяплее. Тапіць печку адразу пасля зімы не кожнаму падабаецца, а жыць у лёгкіх садовых доміках пакуль халаднавата.

А вось за 500-800 долараў кампанія можа зняць на месяц не вельмі вялікі і дарагі, але даволі камфартабельны катэдж з усімі выгодамі. Выбар да мая пакуль ёсць. Сезон толькі пачынаецца...

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## У «ЮБІЛЕЙНАЙ» — УСЁ «ХАКЕЙНА»

**Вынікі паўторных кантрольных праверак аб'ектаў грамадскага харчавання, размешчаных пры гасцініцах Мінска, засведчылі, што практычна ўсе праблемы вырашаны, паведамілі ў Міністэрстве гандлю.**

Яго спецыялісты пры ўдзеле санітарных службаў і іншых зацікаўленых бакоў у сакавіку абследавалі 39 аб'ектаў грамадскага харчавання пры сталічных гасцініцах, якія павінны будуць абслугоўваць удзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі. Гэта такія гасцініцы, як «Вікторыя», «Юбілейная», «Беларусь», «Планета», «Арбіта», «Алмаз», «Зорка», «Спорт-тайм гатэль», «Турыст», «Спадарожнік», «Ваяж» і іншыя. Усім уласнікам былі выдадзены рэкамендацыі аб выпраўленні выяўленых парушэнняў і недахопаў. І вось ужо ў красавіку праверылі, як яны выконваюцца. Па асобных парушэннях, выяўленых у рабоце некаторых аб'ектаў грамадскага харчавання (гасцініц «Алмаз», «Спадарожнік» і «Зорка») складзена 10 пратаколаў для прыцягнення вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці. Пры гэтым самі недахопы былі выпраўлены непасрэдна падчас праверак. Але амаль усе гасцініцы выправілі іх самастойна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РЭЗКАЙ ЗМЕНЫ ТАРЫФАЎ НА САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ НЕ ПЛАНУЕЦЦА

**Пра гэта заявіў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Румак, выступаючы на II Рэспубліканскім сацыяльным форуме «Сацыяльная з'яднанасць у імя ўсеагульных інтарэсаў».**

— Вызначэнне тарыфаў на сацыяльныя паслугі знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовых органаў улады: аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, — сказаў намеснік міністра. — Перыядычна яны пераглядаюцца, але працягваюць заставацца вельмі даступнымі.

Адказваючы на пытанне журналістаў аб адказнасці дзяцей за сваіх пажылых бацькоў, ён адзначыў: «У дзейным заканадаўстве прадугледжаны такія нормы. У адпаведнасці з Кодэксам аб шлюбе і сям'і дзеці нясуць адказнасць за сваіх састарэлых бацькоў». Тым не менш, паводле слоў Аляксандра Румака, дэкрэт, аналагічны Дэкрэту Прэзідэнта №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях», у нашай краіне не распрацоўваецца.

— Але некаторыя змены ў заканадаўства былі ўнесены, — заявіў намеснік міністра. — Так, пажылыя людзі, якія маюць дзяцей працаздольнага ўзросту (дачок да 55 гадоў і сыноў да 60 гадоў), пасяляюцца ў дамы-інтэрнаты агульнага тыпу на ўмове платных паслуг. І калі іх пенсіі не хапае, каб аплаціць сваё знаходжанне ў доме-інтэрнаце, за іх даплачваюць іх дзеці.

Таксама ўнесены змены ў заканадаўства ў частцы прадастаўлення сацыяльных паслуг тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацабслугоўвання насельніцтва. Пажылыя людзі, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі на даму, цяпер аплачваюць гэтыя паслугі ў поўным памеры, калі маюць працаздольных дзяцей. Пры гэтым не мае значэння, дзе пражываюць іх дзеці. Зніжкі на сацпаслугі засталіся толькі для адзінокіх людзей.

**Святлана БУСЬКО.**

## ТЫДЗЕНЬ КАСМАНАЎТЫКІ Ў ТАМАШОЎЦЫ

**На радзіме першага беларускага касманаўта Пятра Клімука ў вёсцы Тамашоўка Брэсцкага раёна праходзіць тыдзень касманаўтыкі. Аб гэтым расказаў дырэктар Тамашоўскай школы Аляксей Жалянюк.**

У школьным музеі штодзень праводзяцца экскурсіі. Выпушчаны святочныя газеты. А вучні 4-8 класаў сустракаліся нядаўна з сястрой Пятра Клімука Антанінай Ільінічнай. Вучням было цікава, як прайшлі школьныя гады касманаўта, чым ён захапляўся ў дзяцінстве.

Малодшыя школьнікі з задавальненнем удзельнічалі ў гульні «Касмічнае падарожжа». Дарэчы, у Тамашоўцы створаны ўсе ўмовы для таго, каб тут выхоўваліся здаровыя хлопчыкі і дзяўчынкі. У школе добра аснашчаны спартыўныя залы, ёсць свой басейн. Калі хто з вучняў захоча звязаць сваё жыццё з космасам, то пярвічную фізічную падрыхтоўку ён можа атрымаць у сваёй навучальнай установе.

**Яна СВЕТАВА.**

## У ДНІ СВЯТ — УЗМОЦНЕНЫ ВАРЫЯНТ НЯСЕННЯ СЛУЖБЫ

**На красавік сёлета, згодна з календарамі каталіцкай і праваслаўнай канфесій, выпадае некалькі рэлігійных свят. Прычым Уваход Гасподні ў Іерусалім (Пальмавая нядзеля, Вербная нядзеля) і Вялікдзень прыпадаюць у абедзвюх канфесій на адзін дзень — адпаведна, 13 і 20 красавіка. Гэта значыць, што людзі будуць ісці і ў цэрквы, і ў касцёлы. А 29 красавіка ў праваслаўных Радуніца.**

Ва ўсе гэтыя дні ў ахове грамадскага парадку плануецца задзейнічаць сілы і сродкі ГУУС Мінгарвыканкама, УУС аблвыканкамаў, унутраных войск і ўстаноў адукацыі МУС. Асабовы склад будзе пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы.

З улікам павелічэння пасажырапатоку ў выхадныя і святочныя дні будзе ўзмоцнена ахова правапарадку на аб'ектах транспарту. Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі распрацоўваюць маршруты аб'езду месцаў правядзення мерапрыемстваў і ва ўзаемадзеянні з камунальнымі службамі прымаюць меры па забеспячэнні камфортных умоў паркоўкі транспартных сродкаў.

Месцы правядзення мерапрыемстваў загадзя агледзяць спецыялісты сапёрна-піратэхнічных груп. Праход туды будзе весціся праз кантрольна-прапускныя пункты з выкарыстаннем стацыянарных і ручных металадэтэктараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДАПАМОГУЦЬ СУДАКУ... АДНЕРАСЦІЦЦА

**12 красавіка на Заслаўскім вадасховішчы ўдзельнікі Беларускага рыбалоўнага інтэрнэт-клуба (БРІК) і супрацоўнікі Мінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету правядуць закладку нерасцілішчаў для аднаўлення судака.**

— Судак з'яўляецца адной з асноўных найбольш каштоўных прамысловых рыб натуральных вадаёмаў. У Беларусі ён водзіцца ў буйных рэках, вадасховішчах і многіх азёрах. Нагадаю, што ў мэтах захавання судака і стварэння спрыяльных умоў для яго аднаўлення з 1 красавіка па 30 мая Мінпрыроды ўстанавіла забарону на яго аматарскую лоўлю па ўсёй краіне, — сказала **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.**

Дапамагчы стварыць спрыяльныя ўмовы для нерасту судака вырашылі і ўдзельнікі Беларускага рыбалоўнага інтэрнэт-клуба. Нерасцілішча ўяўляе сабой канструкцыю з яловых лапак, да якіх потым прыліпне ікра. Інакш, падаючы ў глей, ікрынкі могуць загінуць. Пры дапамозе натуральнай ільняной вяровачкі лапнік прывяжуць да цагліны з гліны. Такім чынам канструкцыя замацуецца на месцы. Выхад удзельнікаў акцыі ў акваторыю вадасховішча будзе забяспечаны пры дапамозе лодак інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

Біялагічнае абгрунтаванне ўладкавання нерасцілішчаў узгоднена з Мінпрыроды. Вызначаны прыкладныя месцы нерасту судака, дзе і будзе праведзена закладка нерасцілішчаў. Бо ў сувязі з добраўпарадкаваннем зоны Заслаўскага вадасховішча месцаў для нерасту рыбы (мелкаводдзе з чаротам) застаецца ўсё менш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НЯЎДАЛЫ МІНЁР «КАРОНЫ»

**Калі нядбайныя школьнікі баяцца кантрольнай і «мініруюць» школу, гэта яшчэ можна неяк разумець. А вось што «натхніла» 66-гадовага пенсіянера на «піянерскія» жарты, высвятляе міліцыя.**

Пажылы брастаўчанін падышоў каля пяці вечара да ахоўніка гіпермаркета «Карона» і паведаміў аб тым, што памяшканне гандлёвага цэнтра замініравана. Па выкліку хутка прыбылі ўсе аператыўныя службы. Тэрмінова з крамы эвакуявалі больш за 900 чалавек. Спецыялісты сапёрна-піратэхнічнай групы з дапамогай службовага сабакі абследавалі памяшканне, але выбуховых прылад не знайшлі. Пенсіянер, які сарваў работу гандлёвага прадпрыемства на працяглы час, быў затрыманы. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа.

**Яна СВЕТАВА.**

■ Наш кашалёк

# БАЗАВАЯ ВЕЛІЧЫНЯ: ПАМЕР МАЕ ЗНАЧЭННЕ

**Як вядома, з 1 красавіка базавая велічыня (БВ) павялічылася да 150 тысяч рублёў (была 130 тысяч). Ад гэтага паказчыка залежаць некаторыя працоўныя выплаты: дапамогі, надбаўкі, прэміі, якія растуць разам з ростам базавай велічыні. А яшчэ з яе ростам павялічваюцца штрафы і дзяржпошліны.**

**Дапамогі і стыпендыі для беспрацоўных**

Дапамога па беспрацоўі з 1 красавіка складае ад 150 да 450 тысяч рублёў на месяц (ад 1 да 3 БВ). Стыпендыя накіраваных на прафнавучанне беспрацоўных складае ад 300 тысяч да 1,2 млн рублёў на месяц (ад 2 да 8 БВ).

**Штрафы**

Штраф за безбілетны праезд у гарадскім пасажырскім транспарце з 1 красавіка павялічыўся на 10 тысяч і склаў 75 тысяч рублёў (0,5 БВ).

За курэнне ў пад'ездзе прадугледжаны штраф да 4 БВ — 600 тысяч рублёў.

За распіццё спіртных напояў у неналежным месцы давядзецца заплаціць да 1,2 млн рублёў (да 8 БВ).

За нецэнзурную лаянку ў грамадскім месцы трэба аддаць ад 300 тысяч да 4,5 млн рублёў (ад 2 да 30 БВ).

**Дзяржпошліны**

Зварот у суд або да натарыуса з гэтага месяца таксама абыдзецца даражэй (на 15%).



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Каб замяніць пашпарт, трэба будзе заплаціць дзяржпошліну ў памеры 75 тысяч рублёў (0,5 БВ).

Падача заявы на заключэнне або скасаванне шлюбу цяпер каштуе 450 тысяч (3 БВ).

Ад базавай велічыні таксама залежыць памер платы пры звароце ў агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі (БТІ), за пражыванне ў дзяржаўным арэндным жыллі і ў інтэрнатах, памеры грашовых прэмій для пераможцаў штогадовых спаборніцтваў на ўборцы ўраджаю, пераможцаў аглядаў-конкурсаў «Лепшы спецыяліст» у розных сферах і інш.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО** ■

# ДАСТАЦЬ ГРОШЫ З УПАКОЎКІ

## ДОБРУШСКІ ВОПЫТ

Падчас размовы высветлілася, што ў Беларусі была спроба пераапрацоўкі Tetra Pak на Добрушскім цэлюлозна-папяровым камбінаце. Мала таго, прадпрыемства стала піянерам сярод краін СНД. Праўда, першая спроба выйшла няўдалай. «У працэсе пераапрацоўкі пастаянна трапляліся рэчывы, з-за якіх установачная машына пераставала працаваць і механізм даводзілася чысціць, — распавядае Вольга Волкава. — Сумесь з поліэтылену, алюмінію і цэлюлозы, якая атрымлівалася на выхадзе, была вельмі вільготнай. Гэтай сыравінай ніхто не цікавіўся, рэшткі матэрыялаў пачалі збірацца на станцыі пераапрацоўкі. У выніку работа ў гэтым кірунку была прыпынена». Дагэтуль спецыялісты Добрушскай фабрыкі не бяруцца за далейшую пераапрацоўку па прычыне забруджанасці адходаў. Па гэтым паказчыку яны падзяляюцца на вытворчыя і спажывецкія (ужо выкарыстаная ўпакоўка, выкінутая на сметнік). Для кожнай групы патрэбна свая тэхналогія. Са спажывецкімі адходамі працаваць складаней, і гэта не ўлічвалася ў добрушскім эксперыменце.

«Мы ведам, што трэба пераапрацоўваць любыя адходы — і вытворчыя, і спажывецкія, — кажа Аляксандр Барсукоў. — Але пытанне ў тым, што мы ўмеем рабіць. Вопыт Добруша паказаў, што нам яшчэ давядзецца паваждацца з тэхналогіяй. Пераапрацоўка Tetra Pak прынясе эканамічную выгаду толькі ў тым выпадку, калі пераапрацоўваць і паперу, і поліэтылен у комплексе».

## ЁСЦЬ ВАРЫЯНТ!

Прадстаўнікі кампаніі Tetra Pak ужо нагледзелі падыходзячы бюджэтны варыянт. Тэхналогію «сухога роспуску», якая зараз толькі апрабіруецца, прыдумалі расійскія вучоныя з Пярмі. Сутнасць такая: кардон падзяляецца на асобныя валокны ў паветранай плыні. Атрымліваецца матэрыял, падобны да экаваты. Поліэтылен ператвараецца ў адмысловы гранулят. На працягу двух гадоў Tetra Pak збіраецца паставіць такую ўстаноўку ў Беларусь.

Па звестках за 2012 год, колькасць адходаў упакоўкі ў краіне складае ад 8 да 10 тысяч тон за год — лічба прыблізная, але вагу мае. Нават у развітых краінах Еўропы аб'ёмы збору адходаў не перавышаюць паловы выкарыстаных упаковак Tetra Pak. «Ад колькасці сабранага «смецця» залежыць моц устаноўкі, і, мяркуючы па лічбах, яе сіла будзе невялікай», — дадала Вольга Волкава.

Дарэчы, ва ўсёй краіне ёсць толькі два месцы, дзе спецыяльна адбіраюць Tetra Pak для далейшай пераапрацоўкі — гэта вышэйзгаданая Добрушская фабрыка і сартавальная станцыя ў Брэсце. Сыравіну пад уласныя патрэбы закупляе Баравіцкая папяровая фабрыка (Ніжні Ноўгарад). Заказчыкі плацяць за тэтрапак па кошце макулатуры, але выгады адпраўшчыкі не атрымліваюць — надта далёка і дорага выходзіць. Неабходнасць мясцовага пункта пераапрацоўкі зразумелая — у такім выпадку беларускія прадпрыемствы змогуць выкарыстоўваюць перапрацаваныя адходы. Аднак пакуль эканамічная выгада праекта застаецца пад пытаннем.

**Кацярына РАДЗЮК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



■ Палітычная пятніца з Аляксандрам Шпакоўскім

# ВАЕННАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ: ВОБРАЗ БУДУЧЫНІ

**Трывожныя падзеі апошняга часу імкліва штурхаюць да пошуку ўнікальных напрамкаў, дзякуючы якім наша краіна будзе інтэгравана ў сусветны кантэкст развітых дзяржаў.**

## СУРОВЫЯ ЎМОВЫ І НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ІСНАВАННЯ

Глабальны эканамічны крызіс пахаваў надзеі ружовых фантазёраў ад палітыкі і эканомікі аб магчымасці «спакойнага існавання» за кошт сферы турыстычных паслуг ды банкаўскага сектара. Відавочна, што «дзяржава-цэх», для якой магчыма стварэнне ўласных вытворчых цыклаў, значна больш запатрабавана і лепш прыстасавана да выжывання ў неспрыяльных умовах, чым «краіна-сад», з яе тысячамі аўтэнтычных кавярняў і рэстаранчыкаў, якія раптам сталі непатрэбнымі.

Менавіта таму асноўным курсам сучаснага Еўрапейскага Саюза аб'яўлена лінія на рэіндустрыялізацыю, то бок на ўзнаўленне і якасны рост прамысловай вытворчасці пры дапамозе цэнтралізаваных праграм дзяржаўнай падтрымкі. Утульная Еўропа, што не так даўно імкнулася пазбавіцца прамысловасці як архаічнай галіны, спрабавала вынесці вытворчасць у трэція краіны, зараз зноў гатова прачынацца пад гукі фабрычнага гудка і робіць стаўку на індустрыялізацыю як фундамент будучага развіцця.

Лагічным працягам глабальнага эканамічнага крызісу стаў канчатковы развал т. зв. «ялцінскай сістэмы бяспекі», што была ўтворана пасля Другой сусветнай вайны, заснавана вакол ролі ААН і ў трохі змененай форме захоўвалася нават пасля знікнення з палітычнай карты свету Савецкага Саюза. Пры гэтым калі пажар рэвалюцый і крывавых канфліктаў на Блізкім Усходзе «цывілізаваны свет» мог не заўважаць (маўляў, далёка), то дэстабілізацыя на Украіне канчаткова палярызавала міжнародную супольнасць, прымусіўшы задумацца шмат якія «краіны-сады» аб стане не толькі ўласнай індустрыі, але і нацыянальнай бяспекі. Такім чынам, праваахоўныя органы, Узброеныя Сілы, вайскова-прамысловы комплекс, што таксама аб'яўляліся «перажыткам мінулага», а то нават і «прыкметай агрэсіі» ў бесклапотным свеце пераможнага лібералізму, знянацку зноў занялі адпаведнае высокае месца ў сістэме грамадскіх адносін.

## ЯК СТАЦЬ «ТЭРЫТОРЫЯЙ РАЗВІЦЦЯ»?

Палярызацыя свету адбываецца не толькі па лініях цывілізацыйнага разлому, але і ў кантэксце падзелу планеты на тэрыторыі развіцця і перыферыю. У першым варыянце краіны будуць самастойнымі актыўнымі суб'ектамі міжнароднай палітыкі, у другім — у лепшым выпадку, аб'ектамі рэалізацыі замежных інтарэсаў, а ў горшым — арэнай канфлікту і геапалітычнага супрацьстаяння. Відавочна, што суверэнітэт будучыні базіруецца на «трох кітах»: здольнасць краіны да вытворчасці ўнікальнай прадукцыі, высокія магчымасці забеспячэння бяспекі і абароны, узровень удзелу ў глабальных інтэграцыйных утварэннях.

Як вядома, Беларусь імкнецца да высокага ўзроўню, і кіраўніцтвам пастаўлена амбітная задача — трапіць у спіс 30-ці найбольш развітых краін свету. Верагодна, што тым унёскам, з якім наша дзяржава плануе быць пазнавальнай у структуры сусветнай эканомікі, стануць машынабудаванне, IT-тэхналогіі, нафтаперапрацоўка, атамная энергетыка і сельская гаспадарка. Апошнім часам да гэтых пазіцый айчынныя і замежныя эксперты дадаюць таксама беларускі ваенна-прамысловы комплекс.

**Утульная Еўропа, што не так даўно імкнулася пазбавіцца прамысловасці як архаічнай галіны, спрабавала вынесці вытворчасць у трэція краіны, зараз зноў гатова прачынацца пад гукі фабрычнага гудка і робіць стаўку на індустрыялізацыю як фундамент будучага развіцця.**

## НОВАЯ МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Рэспубліка Беларусь валодае ўнікальнымі напрацоўкамі ў галіне вытворчасці радыёлакацыйных станцый, што ствараюцца на базе канструктарскага бюро «Радар», вядомасць на сусветным рынку маюць айчынныя аптычныя прыборы, існуюць магчымасці па мадэрнізацыі вайсковай тэхнікі. Уласная тэхналогія стварэння беспілотнікаў (вядомыя мадэлі «Філін», «Грыф», «Сцерх») дазваляе нашай краіне займаць лідарскія пазіцыі ў рэгіёне па вытворчасці высокатэхналагічнай прадукцыі ваеннага і двайнога накірунку. Аднак падобныя дасягненні зусім не з'яўляюцца вяршыняй развіцця беларускага ВПК. 2 красавіка падчас наведвання авіярамонтнага завода ў Баранавічах Прэзідэнт паставіў перад ваеннымі інжынерамі задачу выйсці на вытворчасць уласнай авіяцыйнай тэхнікі — самалётаў і верталётаў, а таксама стварыць магчымасці па вытворчасці ўласнай бронетэхнікі. Асаблівы ўпор Аляксандр Лукашэнка загадаў зрабіць на стварэнні ланцугоў прамысловай кааперацыі з расійскімі і ўкраінскімі партнёрамі.

Існуе погляд, што падобны заказ ад кіраўніка дзяржавы паступіў у выніку аналізу актуальнага міжнароднага становішча, а таксама некаторых змен сістэмы прамысловай кааперацыі ў рэгіёне, што склалася па выніках крызісу ва Украіне. Відавочна, што крызіс адносін паміж Масквой і Кіевам мае досыць доўгатэрміновы характар, што пагражае знікненнем украіна-расійскай ваеннай кааперацыі. Моцны ВПК Украіны, асноўным заказчыкам прадукцыі якога быў расійскі бок, будзе цалкам разбураны. У перспектыве гэта прывядзе да сумных вынікаў не толькі для ўкраінскай эканомікі, але і для інтарэсаў бяспекі Расійскай Федэрацыі і ваенна-палітычнага альянсу АДКБ, бо вельмі ўзмоцніць залежнасць ад замежных вытворцаў зброі.

Такім чынам, захаванне ўкраінскіх тэхналогій ваеннай вытворчасці для мэтаў АДКБ шляхам стварэння двухбаковай прамысловай кааперацыі становіцца не толькі эканамічным экспартным інтарэсам беларускага боку, але стратэгічнай задачай рэгіянальнай бяспекі і саюзным абавязкам. Беларусь ужо мае пазітыўны вопыт супрацоўніцтва з украінскімі вытворцамі ваеннай тэхнікі. Так, у кааперацыі з кампаніяй «Мотар Січ» на пляцоўцы аршанскага авіярамонтнага завода арганізавана вытворчасць рухавікоў для баявых верталётаў, праводзіцца мадэрнізацыя тэхнікі, існуюць іншыя перспектыўныя праекты. Пашырэнне супрацоўніцтва такога кшталту будзе выгадным і для Украіны, і для Беларусі, дазволіць абараніць украінскія інжынерныя і канструктарскія інтэлектуальныя кадры.

Дадатковым фактарам для разумення новых задач ВПК Беларусі з'яўляецца нядаўні візіт віцэ-прэм'ера расійскага ўрада Дзмітрыя Рагозіна ў Мінск. Рагозін з'яўляецца куратарам ваенна-прамысловай вытворчасці Расійскай Федэрацыі, і асноўным інтарэсам чыноўніка было высвятленне магчымасцяў пашырэння беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў гэтай сферы, вызначэнне дадатковых сектараў удзелу беларусаў у расійскіх абаронных заказах.

Відавочна, што ва ўмовах нарастаючага геапалітычнага супрацьстаяння Расія мусіць спадзявацца толькі на ўласныя магчымасці і на сваіх саюзнікаў, што адкрывае перад беларускай прамысловасцю, у тым ліку ваенна-тэхнічнай сферай, прынцыпова новыя задачы развіцця.

Утерянные страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0436191, 0436192, 0534928, 0534929, 0661608, 0604520, 0663725, 0639316, страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 7318318, страховой сертификат, удостоверяющий заключение договора страхования «Зеленая карта» серии BY/12 № 7520806, считать недействительными. УНП 100706519

Утерянное **свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя УНП 101128933** на имя Церлюкевича Андрея Геннадьевича **считать недействительным**.

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні галоўнаму спецыялісту ўпраўлення аператыўна-аналітычнай і інфармацыйнай работы Масько Вользе Аляксандраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# АД ЧАГО ЗМЕНІЦЦА ЛІТАРАТУРА?

TV@R

**Літаратура — мастацтва, якое адным дае прастору для творчасці, іншым — глебу для разважанняў, але нікога не пакідае абыякавым. І праект «Дыя@блог. Пра літаратуру» на тэлеканале «Беларусь 3» яскрава сведчыць пра гэта. Вядучыя Таццяна Сівец, галоўны рэдактар штотыднёвіка «ЛіМ», і Стэла Чыркова, галоўны рэдактар інфармацыйна-аналітычнага партала Femina.by, кожны аўторак абмяркоўваюць са сваімі гасцямі самыя вострыя тэмы літаратурнага жыцця краіны. Пры сустрэчы Таццяна Сівец падзялілася сакрэтамі суіснавання ў кадры, а таксама акрэсліла адметнасці кніжнага рынку і перспектывы беларускай літаратуры.**



***— У «Дыя@блогу. Пра літаратуру» дзве вядучыя, якія працуюць, так бы мовіць, на кантрастах. Чым тлумачыцца такая тактыка?***

— Ідэя, насамрэч, вельмі перспектыўная. Мы, вядома, са Стэлай не рэпеціруем загадзя, але ўсё, што трэба для падрыхтоўкі праграмы, мы робім супольна і вельмі скрупулёзна. Выбіраем гасцей, пішам сцэнарый (кожная — сваю частку), падбіраем відэаматэрыял, ілюстрацыі. Абмяркоўваем пытанні да нашага госця. Такі падыход дазваляе нам падчас эфіру закранаць самыя розныя тэмы. Заўсёды ёсць нешта, пра што хачу гаварыць я, а тэмы, якія мне асабіста нецікавыя, вельмі добра ўдаюцца маёй сувядучай. Такім чынам мы раскрываем госця з розных бакоў. І часам вельмі нечаканыя адкрыцці робім! Галоўнае ж наша адрозненне ў тым, што мы прадстаўнікі розных культур: я — беларускай, яна — расійскай. Рознага менталітэту, светапогляду і стаўлення да жыцця. Таму Стэла часам бачыць тое, чаго не бачу я. Калі я адчуваю гэтую прастору, як чалавек, які ў ёй вырас, жыве і працуе, то для маёй калегі ўсё новае, цікавае, кожны раз яна нешта для сябе адкрывае. А я па-іншаму пазіраю на людзей, якіх ведаю не адзін год.

***— Самыя яркія праграмы можаце ўспомніць?***

— Вылучыць самыя цікавыя ўспаміны не так лёгка. Кожная праграма адметная па-свойму: на адной нам прывезлі цэлую машыну кніжак, на другой ад энергетыкі гераіні выключалася тэхніка. Ці яшчэ здаралася: прыходзіць упэўнены чалавек, які ведае ўсё, а ўключаецца камера, і я бачу, як у яго пачынаюць дрыжаць рукі... І тут задача вядучага падтрымаць яго, дапамагчы справіцца з хваляваннем. Бывае, трэба чалавека спыняць, пераключаць на іншую тэму, калі ён загаварыўся пра штосьці важнае для сябе асабіста, а мы разумеем, што глядач можа засумаваць. Вельмі цікава размаўляць з маладымі аўтарамі. Яны ўсе адметныя. Паэтэса Вольга Гронская надзвычай цікава разважае пра кантакты беларускай літаратуры з замежнай. Маргарыта Латышкевіч у сваім даволі юным узросце глыбока ведае фантастыку, любіць літаратуразнаўства, адчувае асалоду ад працэсу стварэння літаратуры. Анатоль Трафімчык можа распавесці бадай што ўсё пра Якуба Коласа. Для мяне галоўнае падчас эфіру — не заслухацца.

***— Як успрымаецца факт двухмоўя ў праграме аўдыторыяй?***

— Пазіцыя стваральнікаў нашай праграмы такая: ёсць беларуская літаратура, але пэўная частка яе прадстаўнікоў піша па-руску. Таму, адпаведна, і ўзнікла двухмоўе ў нашай праграме. Я разумею і тых, каму яно не зусім даспадобы. Такія людзі слушна лічаць, што беларуская літаратура павінна стварацца на беларускай мове. А некаторым двухмоўе ў эфіры проста цяжка ўспрымаць.

***— Вам камфортна ў такой сітуацыі?***

— Я мяркую, галоўнае, каб гледачы разумелі ўсё, што гаворыцца намі і нашымі гасцямі. Кожны можа рабіць свае высновы, выбіраючы і сваю мову, і сваю літаратуру. Мы паказваем рознае, а выбар заўжды за гледачом.

***— Ці хапае эфірных хвілін для абмеркавання ўсіх пытанняў?***

— Безумоўна, у 26 хвілін эфірнага часу змясціць усё, пра што можа і хоча распавесці госць, няпроста. Таксама хочацца, каб гэты час быў цікавым і карысным для гледачоў, бо адна з асноўных мэт праграмы — паказаць, што ў нас ёсць добрыя аўтары, што выходзяць новыя кнігі, што з гэтымі людзьмі трэба кантактаваць, і не толькі праз іх працу, але і ў інтэрнэце — праз наш блог, выказваць свае думкі... Гэта такая шыкоўная «фішка», якой няма, наколькі я ведаю, не толькі ў Беларусі, але і ў нашых замежных суседзяў. Такое сумяшчэнне сеціва і тэлебачання стварае ў выніку выдатны палілог, у якім можа ўдзельнічаць кожны. Часам надараюцца і прыемныя неспадзяванкі: напрыклад, ніколі не думалі, што на тэму сучаснай паэзіі і прысутнасці ў ёй лаянкі будзе столькі каментарыяў — мы нават не ўсе іх выкарысталі. Літаратура ж не зменіцца ад таго, што нам нешта ў ёй не падабаецца. Варта знайсці патрэбны ракурс, зірнуць збоку.

***— У праграме размова заўсёды ідзе ў спакойным рэчышчы. Няўжо не ўзнікае ніякіх спрэчак, сутыкненняў пазіцый?***

— У эфіры, нават калі чалавек табе не зусім сімпатычны, вы робіце адну справу. Нельга выйсці з гэтай звязкі, сказаць «вы памыляецеся». Я заўсёды спрабую зразумець, што і з якой мэтай агучвае чалавек. І, як вядучая праграмы, я павінна дапамагчы яму выказацца. Мы ўсе адзін аднаго паважаем, і, калі выключаецца камера, ніхто не кідаецца біцца. Апошняе слова заўжды за гледачом. А каб сказаць, добрая ці кепская кніга, спачатку трэба яе прачытаць. Дарэчы, калі я асабіста не зусім прымаю тое, што робіць мой госць, рыхтуюся ў два разы больш. Мне важна прачытаць напісанае ім, выказанае ў іншых інтэрв'ю. Я імкнуся адкрыць для сябе чалавека яшчэ да таго, як ён патрапіць у эфір. Падчас гутаркі ў студыі здаралася і такое, што мая думка пра чалавека мянялася карэнным чынам...

***— Ведаючы літаратурны рынак знутры, можаце сказаць, якой літаратуры сёння не хапае?***

— Думаю, галоўнае, чаго нам бракуе, — якраз чытачоў. Людзей, якія пішуць добра, сёння шмат. А вось тое, што чытаць сталі менш, — факт, які нават статыстыкай пацверджаны. У тых, хто і раней чытаў, з'явілася магчымасць чытаць і электронныя кнігі, і папяровыя. А вось колькасць людзей, якія зусім не чытаюць, таксама павялічылася, на жаль. Навошта, да прыкладу, школьніку напружвацца і чытаць цалкам твор, калі можна знайсці кароткі пераказ альбо паглядзець кіно? Так думае не толькі ён, але часам і яго бацькі — і толькі, магчыма, гадоў праз дзесяць акажацца, што непрачытанае такім і застанецца, хутчэй за ўсё, назаўжды. І ніяк не паўплывае на асобу. На ўсіх нас, напэўна, зрабілі ўплыў тыя кнігі, якія мы чыталі ў дзяцінстве, у юнацтве. Я кажу і за сябе таксама: без Януша Корчака, Марыны Цвятаевай, твораў Артура Вольскага, нават без кніжкі «Мы з Санькам у тыле ворага» Івана Сяркова не было б той мяне, якая ёсць сёння.

**Кожная праграма адметная па-свойму: на адной нам прывезлі цэлую машыну кніжак, на другой ад энергетыкі гераіні выключалася тэхніка.**

***— Якімі тэндэнцыямі характарызуецца сёння беларуская літаратура?***

— Куды мы рухаемся, пакажа час. Але пра пошукі будучыні яшчэ Кузьма Чорны пісаў, а мы ўсё яшчэ яе шукаем. Мне здаецца, трэба нарэшце перастаць шукаць і спадзявацца, што заўтра нехта напіша нашу літаратуру. Трэба ствараць яе сёння і самім. На рух літаратуры цяжка паўплываць. Ён — як плынь жыцця: хочам мы таго ці не, але пасля зімы прыходзіць вясна. І нават глабальнае пацяпленне не адмяняе адвечнага парадку. Так і ў літаратуры. Ёсць перыяды заняпаду і спакою, час раскідваць камяні і час іх збіраць. І новы твор не робіцца адразу ўсеагульнай з'явай у літаратуры, за рэдкімі выключэннямі. Патрэбны час для таго каб ён не толькі з'явіўся, але каб людзі «даспелі» да яго ўсведамлення. Сённяшнія аўтары маюць магчымасць пісаць так, як яны хочуць: у іх няма забароны і цэнзуры. Ёсць інтэрнэт, дзе можна выкласці абсалютна ўсё. Але тут узнікае іншая праблема — самацэнзура ў беларускай літаратуры, выхаваная стагоддзямі забароны. Напэўна, яна генетычна ўплывае на падсвядомасць нашых аўтараў. Можа, таму сучасная літаратура такая закрытая, развіваецца ўнутры сябе. І калі моладзь, якая піша сёння, здолее выйсці за межы, акрэсленыя папярэднікамі, зможа прабіць гэты кокан, то гэта і будзе заўтрашні дзень беларускай літаратуры. Не трэба забывацца, што сённяшнія класікі — людзі выхаваныя савецкім часам і за іх творчасць адказны менавіта той час. Таму, гаворачы пра апекаванне маладой літаратуры, мы працуем на будучыню, і класічныя творы XXI стагоддзя пішуцца цяпер. Іх з'яўленне залежыць ад таго, наколькі сёння падтрымаюць маладых творцаў і ці будуць у іх умовы для працы.

***— Памятаеце час, калі самі пачалі пісаць?***

— Для мяне пунктам адліку стаў адзін з нумароў часопіса «Бярозка» за 1993 год, у якім я прачытала вершы Анатоля Сыса і Вольгі Куртаніч. Я зразумела: вось яна, сучасная літаратура, дзе пішуць настолькі ашаламляльна і цікава, што мне самой захацелася паспрабаваць стварыць нешта падобнае. Як любы малады аўтар, я была ўпэўнена, што ў мяне ўсё атрымаецца... Дзякуй Богу, што на маім шляху сустрэліся старэйшыя пісьменнікі, якія дапамаглі. Я памятаю і тую выязную секцыю дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў, і творцаў, якія прыехалі да нас у школу на літаб'яднанне: слухалі, давалі парады, нават бралі некаторыя творы, каб надрукаваць у газеце. Так, дзякуючы Артуру Вольскаму і Міколу Чарняўскаму мае вершы апынуліся ў «Чырвонцы».

***— Якімі былі адчуванні, калі ў руках трымалі сваю першую кнігу?***

— Гэта адчуванне найлепш апісаў Максім Багдановіч, выгукнуўшы: «Я не самотны, я кнігу маю!» І, мабыць, тое адчуванне можна параўнаць з пачуццямі маці, якая трымае на руках першынца. Тут і здзіўленне: маўляў, няўжо гэта маё? І шчасце ад таго, што ўсё адбылося-атрымалася. Першы крок зроблены, і ты разумееш: магчыма, будзе яшчэ другі і трэці — цэлая дарога перад табою... Каб яна была, трэба проста ісці.

**Алена ДРАПКО.**



■ Неасабісты суб'ектыў

# СТУПЕНЬ АБАРОНЕНАСЦІ



## Калі за нашых старых ёсць каму заступіцца, пакрыўдзіць іх наўрад ці хто асмеліцца

Нядаўна на хутары каля вёскі Алінец у Смаргонскім раёне ўначы разыгралася драма, якая ператварылася ў трагедыю. Гаспадары тым познім вечарам гасцей не клікалі і не чакалі — тыя прыехалі без запрашэння. Чацвёра маладых дзецюкоў падкацілі на машыне да адзінока стаячай хаты, двое з іх пачалі грукаць у дзверы, а калі ім не адчынілі, пачалі дзверы ламаць. Гаспадар, яшчэ моцны 54-гадовы мужчына, вырашыў ад раз'юшаных незнаёмцаў свае маёмасць і жыццё бараніць: папярэдзіўшы, што выкліча міліцыю і будзе страляць, і ўбачыўшы, што папярэджанне эфекту не мае, стрэліў з паляўнічага ружжа дробам у дзверы. Вырашыўшы, што няпрошаныя госці сышлі, выйшаў у двор. Тыя двое, аказалася, толькі гэтага і чакалі — накінуліся на мужчыну ззаду, разбілі твар, паламалі рэбры. Невядома, чым бы скончылася гэта для гаспадара, калі б ён не выстраліў у аднаго з нападаўшых. І тут драма стала трагедыяй: ён трапіў 28-гадоваму хлопцу ў сцягно і паранены ў той жа дзень памёр у бальніцы... Цяпер распачата крымінальная справа, вядзецца следства. Яму і належыць высветліць матывы, якімі кіраваліся тыя, хто нападаў. І галоўнае: ці не перавысіў ступень абароны той, на каго нападалі?

Уражанні ад гэтай гісторыі, якая на днях з'явілася на лентах інфармацыйных агенцтваў, — самыя розныя. Пачынаеш думаць і аб шэрагу падзей і выпадковасцяў, з якіх у рэшце рэшт сплятаюцца нечыя жыццё і смерць. Шкада таго няшчаснага хлопца — і таму, што не хапіла розуму і развагі не ехаць на тыя разборкі; дый проста таму, што было яму ўсяго 28 гадоў. Але найбольш не дае спакою, ведаеце, якое ўяўленне? Што, калі б гаспадару было не пяцьдзясят чатыры, а семдзесят? Што, калі б у яго не было стрэльбы? Колькі старых, якія адны жывуць у маленькіх вёсках? Колькі ходзіць па зямлі іх патэнцыяльных крыўдзіцеляў — ад мясцовых выпівох, якія ў пошуках апахмелу нярэдка проста вымагаюць у састарэлых суседзяў грошы, да заезджых гастралёраў, якія просяцца ў хату папіць вады, а пасля, прыкрываючыся шчырай размовай і зацікаўленасцю, употай выносяць з хаты тыя невялікія зберажэнні, якія бабуля з пенсіі адкладвала «на смерць»...

Ігэтыя пытанні зусім не з разраду крымінальных, як адразу можна падумаць. Калі капнуць глыбей — яны самыя што ні ёсць сацыяльныя. Раней, яшчэ гадоў трыццаць таму, падобная праблема і ўзнікнуць не магла, бо старыя людзі заставаліся ў вёсцы адны ў рэдкіх выпадках, толькі па волі жорсткага лёсу, які не даў на схіле веку дзяцей ды ўнукаў. А так у кожнай хаце жыло некалькі пакаленняў, як вялося спрадвеку, таму нікому нават у галаву прыйсці не магло пакрыўдзіць ці абабраць нямоглага старога чалавека. Цяпер спакуса для тых жа выпівох ці лайдакоў — на кожным кроку. Пры жывых здаровых дзецях, унуках, праўнуках нашы бацькі застаюцца адны ў сваіх вясковых хатах, запіраюцца на ўсе замкі, не тушаць па начах святло, моляцца перад абразамі... Каля кожнай хаты, дзе жыве адзін ці двое старых, не паставіш на варце міліцыянера. Усіх, хто бачыць у гэтых старых крыніцу лёгкай нажывы, не возьмеш на ўлік, не прывядзеш да розуму. Нашых вясковых бацькоў не пасадзіш у гарадскіх кватэрах — «цэглу нюхаць» яны пагодзяцца ў лепшым выпадку толькі ў самы халодны час, а як толькі сагрэтая зямля пакліча — іх у горадзе ўтрымаць немагчыма. Самі мы ў вёску, да роднай хаты — хіба на выхадныя ці ў водпуск. Бо ў горадзе ўсё: і жыллё, і праца, і сябры... Вось такое замкнёнае кола. Атрымліваецца, спадзявацца можна толькі на літасцівы лёс, які праўдзе ліхоха чалавека міма нашай роднай хаты, дзе маці штовечар просіць у Бога дапамогі і апякунства для нас, пералічваючы ўсю вялікую радню па імёнах?..

У нашай вёсцы некалькі гадоў таму ненадоўга з'явіўся новы жыхар. Спадчыннік старой хаты, у якой свой век дажыла баба Аміля, мажны барадаты мужчына. Як высветлілася, гэта быў Амілін унук, якога ў вёсцы ніколі не бачылі, бо з законам ён не сябраваў і на волі бываў нядоўга. Пасля чарговага вызвалення ён вырашыў атабарыцца ў бабчынай хаце. Прычым, каб не было сумна, прывёз з сабой кампанію сяброў і пачаў ладзіць сваё жыццё, а заадно і жыццё вёскі па законах «зоны». Праз тыдзень нашы бабулі-матулі ўжо баяліся выйсці лішні раз на вуліцу, каб не сутыкнуцца з барадатым п'яным тварам. Доўжылася гэта яшчэ тыдзень. Пасля нашы хлопцы-гараджане на чале з уласнікам невялікага мясцовага прадпрыемства, у якога ў вёсцы жыве маці, а на лета прыязджае і цешча, узялі «цёплую кампанію» пад белыя рукі, пагрузілі ў аўтобус, вывезлі за межы раёна, высадзілі на трасе і ветліва параілі больш не вяртацца. Гэтага хапіла. Цяпер у вёсцы цішыня і спакой, а мясцовыя п'яніцы асцерагаюцца нават лаяцца ў адрас якой бабулі. Усё проста: яны ведаюць, што за старых ёсць каму заступіцца, што пакрыўдзіць іх беспакарана наўрад ці атрымаецца.

І гэтае веданне — самая надзейная абарона. І ўзводзіць яе вакол нашых самых дарагіх людзей павінны найперш мы самі. Часцей (а не раз у месяц) прыязджаючы. Пастаянна тэлефануючы (гэта ж зусім нескладана — набраць нумар маці, увечары пажадаць ёй добрай ночы, а раніцай пацікавіцца, як яна спала і як сябе адчувае). І дзяцей на канікулы — не ў заморскі лагер, як цяпер модна, а да бабулі (адпачнуць не горш, а заадно і зразумеюць, што, акрамя камп'ютара, на свеце столькі ўсяго ёсць цікавага)...

Зрэшты, пра што гэта я? Кожны і сам усё гэта выдатна ведае і разумее. Гэта ж складнікі простай чалавечай любові, гэта як хлеб, як паветра...

Выходзіць, і хвалявацца няма чаго?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ У эфіры

# У «Акадэміі талентаў» б'юцца ўсур'ёз

**Праўда, толькі ў межах праекта і выключна ў творчым сэнсе. «Трэці курс» папулярнага рэаліці-шоу, пераможца якога атрымае рэальны шанц увайсці ў парадныя дзверы шоу-бізнесу, пераходзіць да новага вітка спаборніцтва — так званых музычных батлаў.**

Па выніках маштабнага праслухоўвання «жыўцом» прадзюсары Павел Клышэўскі, Яна Станкевіч і Леанід Шырын сфарміравалі тры каманды — па 9 чалавек у кожнай. Прычым некаторыя імёны «студэнтаў» публіцы ўжо добра знаёмыя: напрыклад, свае сілы на праекце спрабуе колішні ўдзельнік дзіцячага «Еўрабачання-2006» Андрэй Кунец (між іншым, на тым конкурсе ён заняў 2-е месца!), а спявак Алег Шчуцкі пад сцэнічным псеўданімам Alen Hit некалькі гадоў таму ўдзельнічаў у адборах на «Новую хвалю» і «Еўрабачанне». Каманда Леаніда Шырына вылучаецца тым, што ў яе трапілі адны толькі дзяўчаты, а ў групе Паўла Клышэўскага — самы сталы ўдзельнік праекта, 52-гадовы оперны выканаўца Ілья Астроў, які, між іншым, складае годную канкурэнцыю моладзі.

Ужо з 12 красавіка, як расказалі нам у прэс-службе тэлеканала АНТ, у праекце пачынаецца новы этап. Прадзюсары ў кампаніі новай вядучай — Лейлу Ісмаілаву заменіць Леся Кодуш — будуць правяраць, як таленавітыя студэнты засвоілі ўрокі майстэрства, і па выніках экзамену штотыдзень у «Акадэміі талентаў» будуць адбывацца адлічэнні непаспяховых.

**Калі**: *па суботах у 18.45.* **Дзе**: *АНТ.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 14 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.10** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.50** «Мая праўда». «Святлана Пермякова. Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**12.10, 0.55** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.05 Серыял «Шулер».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.45 Серыял «След».**
**16.30** Дак. цыкл «Сямейныя меладрамы».
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Вербная нядзеля». 1-я і 2-я серыі.**
**23.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.45** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.05, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфра 2».**
**10.40, 0.20 Серыял «Я — целаахоўнік».**
**11.45 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**14.05** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**14.35 Баявік «Нацыянальная бяспека».**
**16.20, 23.35** Ток-шоу «Перазагрузка».
**17.00** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**18.55 Серыял «Бывай, каханая». 1-я, 2-я серыі.**
**20.50** Цела чалавека.
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**22.40 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**1.10** Музычны конкурс «GBOB» у Беларусі.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.15, 14.55, 16.55, 21.05, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.25, 15.05, 17.05, 0.30** «Сімвалы эпохі». Партыйны білет.
**8.20 Дзіцячы фільм. «Казакі-разбойнікі».**
**9.25, 22.00** «Дыя@блог». «Пра мову».
**9.50, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**10.35, 23.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці опернай спявачкі, народнай артысткі СССР Святланы Данілюк.
**11.05, 14.35, 16.10, 18.45** «Размаўляем па-беларуску».
**11.10** С. Ясенін. «Ганна Снегіна».
**12.35 «Без сонца». Маст. фільм.**
**14.20** «Музеум». Выданні Скарыны.
**14.40** М/ф.
**15.20** «Творцы». Народны артыст Беларусі, рэжысёр Канстанцін Саннікаў.
**15.45** «Цуды прыроды».
**16.15** «Палескі пачастунак». Пірог са шчаўем і запечаны шчупак.
**16.30** «Тэатральны ліцэй».
**17.20** «Госць». Кароткаметражны фільм.
**17.50** «Наша спадчына». Палац у Дзятлаве. Часткі 1-я і 2-я.
**18.20** «Адкрыццё». Пісьменнік Алесь Адамовіч.
**18.50** «Пра каханне...». Драматычная гісторыя Барбары Радзівіл і Караля Жыгімонта ІІ Аўгуста.
**19.20** «Падарожжа са смакам».
**19.55 Серыял «Зорка эпохі». 1-я серыя.**
**20.45** Калыханка.
**22.30 «Сэрцы чатырох». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Вест Бромвіч» — «Тотэнхэм».
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Суонсі» — «Чэлсі».
**11.50** Хакей. КХЛ. Фінал. Канферэнцыя «Усход». 6-ы матч.
**13.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Ліверпуль» — «Манчэстэр Сіці».
**15.35** Гандбол. SEHA-ліга. Фінал чатырох. Паўфінал. «Заграб» (Харватыя) — «Вардар» (Македонія).
**17.00** Футбол. На шляху да чэмпіянату свету-2014. Відэачасопіс.
**17.30** Гандбол. SEHA-ліга. Фінал чатырох. Паўфінал. «Татран» (Славакія) — «БГК ім. Мяшкова» (Беларусь).
**19.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**19.55** Хакей. КХЛ. Фінал. Канферэнцыя «Захад. 6-ы матч. «Леў» — «Лакаматыў».
**22.20** Час футбола.
**23.00** Алімпійскія гульні. Сочы-2014. Урачыстая цырымонія закрыцця.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Востраў Крым».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Спецпасяленцы. Сялянская трагедыя». Фільм першы.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** Канцэрт Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь з удзелам К. Масковіча і С. Мільштэйна.
**23.20 Маст. фільм «Каханне і іншыя акалічнасці».**
**1.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Такі лёс».
**12.30** «Чатыры вяселлі».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.30** «Не хлусі мне!».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Ежа багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Глыбокае сіняе мора».**
**22.15** «Глядзець усім!».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.15** Беларусь сёння.
**8.15 Серыял «Прыватны дэтэктыў».**
**10.00, 0.50 Маст. фільм «Стаянка цягніка — дзве хвіліны».**
**11.30** «Наша марка».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.20, 23.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10, 3.50 Серыял «Монтэкрыста».**
**18.20 Серыял «Двое з куфра».**
**21.20 Серыял «Нож у аблоках».**
**23.05** «Беларусь сёння».
**0.25** «Агульны інтарэс».
**2.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.25** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Завяшчанне Леанарда. Гісторыя аднаго абрабавання».
**15.35** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**18.55 Серыял «Асабовая справа».**
**20.45 Серыял «Скліфасоўскі-3».**
**23.35** «Знесеныя морам».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35, 23.00** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Чужы раён».**
**21.15 Серыял «Брацянікі».**
**23.20** Сёння. Вынікі.
**23.45 Камедыя «Афраідыты».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.35, 19.05, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**8.15 Серыял «Светлячок».**
**9.45, 17.55 Серыял «Белая каралева».**
**10.55 Камедыя «Пісьмы да Джульеты».**
**12.40 Серыял «У чым віна Фатмагуль», 1-я серыя.**
**14.40** Тэлемагазін.
**15.10 Серыял «Айцец Браўн».**
**16.05** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Тэорыя хлусні».**
**19.10 Серыял «Тайныя сувязі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Востраў».**
**23.05 Серыял «Спіс кліентаў».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** "PLAY".
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.15, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**10.00** «Яда па правілах і без».
**11.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 23.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Фэнтэзі «Апошні легіён».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**20.00 Серыял «Кухня».**
**21.10 Меладрама «У краіне жанчын».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 23.45** «Наглядальнік».
**10.15, 22.50 Серыял «Іваноў».**
**11.10** Важныя рэчы. «Духоўны рэгламент».
**11.25** «Лінія жыцця». Ілзэ Ліепа.
**12.20** Дак. фільм «Быць прыгожым у Эфіопіі».
**13.10 Серыял «Курсанты».**
**14.10** Прафесіяналы. Тэлеспектакль. «Маленькая дзяўчынка».
**15.55** Дак. фільм «Леў Карсавін. Метафізіка кахання».
**16.25** Успамінаючы Мікалая Пятрова. Сольны канцэрт у БЗК. Запіс 2005 года.
**17.30** Царыца Нябесная. Абраз Уладзімірскай Божай Маці.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.10** «Правілы жыцця».
**19.40** Да 75-годдзя Івана Бортніка. «Астравы».
**20.20** «Тым часам».
**21.05** Дак. серыял «Старцы».
**21.35** Дак. фільм «Раскрыццё тайн Вавілона». 1-я серыя.
**0.40** Нацыянальны філарманічны аркестр Расіі. Канцэрт у ММДМ.
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2004 год.
**6.05, 19.35** Канцэрт замежнай эстрады.
**6.25** «Шоу — біс. Гумар і спорт». 1993 год.
**7.30** «Пад знакам задыяка. Авен». 1994 год.
**9.00 «Мой пяшчотна любімы дэтэктыў». Маст. фільм.**
**10.20** «Музыка дажджу». Фільм-канцэрт.
**11.00** «Не люба — не слухай...». 1991 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Поле цудаў». 1994 год.
**14.05** «50/50». 1994 год.
**15.20** «Любімыя старонкі. Мастацтва належыць народу». Фільм-спектакль.
**17.00** «Кліч джунгляў». 1994 год.
**17.35** «Будзільнік». 1984 год.
**18.10** «Мы — клоўны». Фільм-канцэрт.
**18.30, 0.30 Серыял «Дзень за днём».**
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Ала Пугачова сустракае сяброў». 1994 год. 1 частка.
**23.00** «Народны артыст СССР Васіль Мяркур'еў». 1979 год.
**0.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**4.00** «Кінапанарама». 1982 год. 2 частка.

### EUROSPORT

**5.30** Аўта- і матаспорт.
**5.45** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**7.00, 10.30** Веласпорт. Парыж — Рубэ.
**7.45** Веласпорт.
**8.00** Лыжныя гонкі.
**9.00, 17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**11.15** Футбол. «Рэал Мадрыд» (Іспанія) — «Бенфіка» (Партугалія).
**12.15** Футбол. «Шальке-04» (Германія) — «Барселона» (Іспанія).
**13.15, 19.30** Футбол. Фінал.
**15.45, 21.15** Футбол. Еўрагалы.
**16.45, 21.00** Футбол. Бразілеманія.
**17.45** Тэлечасопіс WATTS.
**18.00** Пра рэслінг.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.05, 2.20** Серыял «Маё вялікае грэчаскае жыццё».
**6.00, 8.40, 13.50, 20.45, 23.50, 1.50, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «Бацька нявесты».
**9.00** Камедыя «Чаго чакаць, калі чакаеш дзіця».
**11.15** Камедыя «Бацька нявесты-2».
**14.10** Мюзікл «Светлыя Каляды».
**16.25, 21.00** Серыял «Пасля твайго адыходу».
**17.20** Камедыя «Іронія кахання».
**19.20** Камедыя «Шэф».
**22.10** Камедыя «Заняпад мужчынскай імперыі».
**0.10** Камедыя «Руд і Сэм».
**3.25** Камедыя «Лэдзі кажа «не».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**8.40, 18.30, 3.05** Серыял «Забароненае каханне».
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.15** «Жонка. Гісторыя кахання». Дар'я Данцова.
**14.30** «Сто пытанняў даросла141 ламу». Аляксандр Маршал.
**15.15, 0.00, 5.15** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.15** Серыял «Контргульня».
**21.15, 4.30** Серыял «Чырвоная капэла».
**22.15** Маст. фільм «Карсіканец».
**0.45** Серыял «Хадзячыя мерцвякі».
**1.30** «Часова даступны». Ігар Крутой.
**2.25** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00, 16.40** Драма «Розум і пачуцці».
**7.20** Камедыя «Сцюарт Літл 2».
**8.45** Драма «Сірыяна».
**11.00** Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
**12.50** Драма «Мой хлопец — псіх».
**15.00** Трагікамедыя «Геніяльны тата».
**19.00** Фантастыка «Зыходны код».
**20.40** Драма «Чорнае золата».
**22.55** Драма «Закаханыя».
**0.40** Драма «Вяртанне ў рай».
**2.40** Трылер «Тайнае акно».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Трагікамедыя «Нябесныя ластаўкі».
**8.40** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**10.10** Камедыя «У Расію па каханне!».
**11.50** Камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».
**13.05** Баявік «Бой з ценем».
**15.25** Баявік «Бой з ценем: Рэванш».
**17.45** Баявік «Бой з ценем 3D: Апошні раўнд».
**20.00** Меладрама «Летам я аддаю перавагу вяселлю».
**21.40** Баявік «Сяброўства асобага прызначэння».
**23.20** Драма «Дзесяць гадоў без права перапіскі».
**1.10** Драма «Водпуск у верасні».
**4.00** Меладрама «Белая сукенка».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
**7.00** Ноч ільва.
**8.00, 13.00, 18.00, 21.00, 0.00, 3.00** Космас.
**10.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**11.00** Мегазаводы.
**12.00** Золата горада-прывіда.
**15.00** Напад нільскага кракадзіла.
**16.00** Забойства Лінкольна.
**17.00, 2.00** Тайны гісторыі.
**17.30, 2.30** Скарбашукальнікі.
**20.00, 1.00, 4.00** Навука будучыні.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00** Амерыканскі чопер.
**7.50, 12.20** Сысці ад пагоні.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**16.00** Пятая передача.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Скануючы неба.
**19.10** Навука магіі.
**21.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**22.00** Выжыванне без купюр.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**0.00** Кландайк.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Будучыня.

# ПЯТНІЦА, 18 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «Вербная нядзеля». Заключныя серыі.**
**11.05, 19.55 Серыял «Парфумерка».**
**11.55, 15.25** Галявая перадача.
**12.10, 1.25** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.10 Серыял «9 месяцаў».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30, 2.15 Серыял «След».**
**16.20** Дак. цыкл «Сямейныя меладрамы».
**17.15** «Мая праўда». «Альбана Карызі. Каварная фелічыта».
**18.10** Тайны следства.
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55** Журналісцкае расследаванне.
**22.30 Прыгоды «Піраты Карыбскага мора: праклён «Чорнай жамчужыны».**
**1.10** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфра 2».**
**10.10** Стыль-бюро.
**10.50** «Два з паловай кухары».
**11.25** Пад грыфам «Вядомыя».
**12.05 Серыял «Бывай, каханая». Заключныя серыі.**
**14.10 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**15.15 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**16.25** «Імперыя песні».
**17.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**19.00 Прыгоды «Чалавек-павук 2».**
**21.25** КЕНО.
**21.30** Бітва экстрасэнсаў.
**22.40** Рэпарцёр.
**23.25** «Comedy woman».
**0.20 Трылер «Цёмны бок страсці».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.45** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.25, 14.55, 17.00, 21.05, 1.00** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.35, 15.05, 17.10, 1.10** «Сімвалы эпохі». Картка спажыўца.
**8.20 Серыял «Зорка эпохі».**
**9.15, 21.55** «Сіла веры».
**9.45, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**10.35, 0.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці балерыны, народнай артысткі Беларусі Аляксандры Нікалаевай.
**11.05, 13.50, 16.05, 18.25** «Размаўляем па-беларуску».
**11.10** «Паўлінка». Экранізацыя спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.
**12.45** «Настальжы» Любоў Румянцава.
**13.15** «І смех, і бяда». Кароткаметражны фільм па апавяданнях Якуба Коласа.
**14.00** «Маскоўскі Крэмль». Дак. фільм.
**15.20** «Пейзажы скрозь час». «Аліўкавы гай» Рэнуара на поўдні.
**15.50** М/ф.
**16.10** «Тэатральны ліцэй».
**16.40** «Летуценні Я. Драздовіча». Пра вядомага беларускага мастака.
**17.20** «Плошча мастацтваў». Паэт, журналіст, рэдактар Юрый Сапажкоў.
**17.50** «Случэск. Случск. Слуцк». Дак. фільм.
**18.05** «Вяртанне». Дак. фільм пра Андрэя Звягінцава.
**18.30** «Святыні зямлі беларускай». Дак. фільм.
**19.00 «Інкогніта з Пецярбурга». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**22.25** Трансляцыя Хроснага шляху з Рымскага Калізея з удзелам Папы Рымскага Францыска I.
**0.10** «АРТіШОК».

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10, 12.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/4 фіналу. Матч у адказ.
**9.55** Авертайм.
**10.25, 18.55** Хакей. Еўравыклік. Беларусь — Швейцарыя.
**14.10** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд гульнявога дня.
**15.05** Тэніс. Турнір ВТА. Індыян-Уэйлс. Фінал.
**16.55** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» — «Дынама» (Брэст).
**21.15** Хакей. КХЛ. Фінал.
**23.35** Фактар сілы.
**0.00** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію».**
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Адваротны адлік». «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя».
**15.30** «Вучыцца жыць».
**16.15** «Востраў Крым».
**16.55** «Шкодны здаровы лад жыцця».
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Вячэрні Мінск».
**22.20 Маст. фільм «З Парыжа з любоўю».**
**0.00 Маст. фільм «Хуткасць 2».**
**2.10** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Вам і не снілася».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Шай-бу! Shai-BY!..».
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.50 Маст. фільм «Сон у летнюю ноч».**
**15.35** «Не хлусі мне!».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** 1/8 фіналу Цэнтральнай Міжнароднай лігі КВЗ.
**22.00, 23.00** «На тым жа месцы ў той жа час».
**23.50** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**0.35 Маст. фільм «Дама без камелій».**

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.15, 2.50 Серыял «Спас пад бярозамі».**
**9.55 Маст. фільм «Камандзіроўка».**
**11.30, 4.25** «Сардэчна запрашаем».
**12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05, 1.55** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.20** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**16.00, 23.45 Серыял «Мантэкрыста».**
**18.20 Серыял «Тэрор каханнем».**
**21.40** Канцэрт Крысціны Арбакайтэ «Пацалунак на біс».
**22.55** Скетч-шоу «МасГарСмех».
**1.45** «Прыгоды Македонскай».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Асаблівы выпадак».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45 Серыял «Капітан Гардзееў».**
**13.50, 16.50, 19.50, 22.50** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Ландышы для каралевы. Гелена Веліканава».
**15.35** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**16.35** «Уся Расія».
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**18.55 Серыял «Асабовая справа».**
**21.00** «Паядынак».
**23.00** «Нам яго не хапае. Успамінаючы Ілью Алейнікава».
**23.55 Маст. фільм «Пятровіч».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Чужы раён».**
**22.15 Серыял «Дзікі».**
**23.50 Дэтэктыў «Канец свету».**
**1.20** «Авіятары».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.30, 19.05, 20.55, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30 Драма «Хаціка. Самы верны сябар».**
**9.25, 17.55 Серыял «Белая каралева».**
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**12.35** Дак. фільм «Вялікдзень».
**13.35 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
**15.10 Серыял «Айцец Браўн».**
**16.25** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Вікінгі».**
**17.50** Тэлемагазін.
**18.10** Дак. фільм «Турынская плашчаніца».
**19.10 Серыял «Агенты».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Прыгоды «Вайна светаў».**
**23.00 Серыял «Спіс кліентаў».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.10, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Лэдзі на мільён».
**10.00** «Гардэроб на вылет».
**11.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 23.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Камедыя «Пасля прачытання спаліць».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Меладрама «Уімблдон».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.40** Навіны культуры.
**9.20 Маст. фільм «Беспасажніца».**
**11.00** «Сусветныя скарбы культуры».
**11.20** «Правілы жыцця».
**11.45** «Пісьмы з правінцыі».
**12.15** Дак. фільм «Вечны горад Ціуанака».
**13.05** Успамінаючы Іну Ліснянскую. «Восеньскія партрэты».
**14.10** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**14.50 Маст. фільм «Справы сардэчныя».**
**16.25** Білет у Вялікі.
**17.05** П. І. Чайкоўскі. Сімфонія № 6 «Патэтычная».
**18.15** «Астравы». Нона Мардзюкова.
**18.55 Маст. фільм «Бацькаў дом».**
**20.30** «Лінія жыцця». Вячаслаў Гардзееў.
**21.25** Дак. фільм «Рускі Леанарда. Павел Фларэнскі».
**21.50** Уладзімір Співакоў і Акадэмічны Вялікі хор «Майстры харавога спеву». Канцэрт у ММДМ.
**23.00 Маст. фільм «Рым — адкрыты горад».**
**0.50** Дак. фільм «Іван Айвазоўскі».
**0.55** Дак. фільм «Матушка Вялікая».
**1.35** Пяць капрысаў Н. Паганіні.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Пад знакам «Пі». 1991 год.
**5.50** «Маналог». Фільм-канцэрт.
**6.30, 12.35, 18.35, 0.30** Серыял «Дзень за днём».
**7.45** «Жаночы погляд на мужчынскія праблемы». Дак. фільм.
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 16.00** «Ля самага Чорнага мора». 1993 год.
**11.00** «Павел Луспякаеў». Дак. фільм.
**12.15** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**17.00** «У нас у гасцях Булат Акуджава». 1972 год.
**17.20** «Ранішняя пошта». «Тэатр». 1988 год.
**18.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**21.00** «Колба часу».
**22.00** «Кінапанарама». 1991 год. 1-я частка.
**23.00** «Апантаны з Вісконсіна». 1971 год.
**23.35** «Яшчэ адна ўсмешка». Тэлефільм.
**0.05** Канцэрт замежнай эстрады.
**1.45** «Добрай ночы, малыя». 1990 год.
**4.00** «Ала Пугачова сустракае сяброў». 1994 год. 2 частка.

### EUROSPORT

**5.30, 9.00, 14.00** Спідвей. Чэмпіянат Еўропы.
**7.00** Снукер. Фінал.
**11.00** Снукер. Welsh Open. Фінал.
**12.00** Снукер. Хайку Уорлд Оўпен. Фінал.
**13.30** All Sports.
**15.45** Конны спорт. Скачкі.
**16.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў.
**17.00** Цімберспортс. Чэмпіянат свету.
**18.00** Бокс. R. Jkitou (Францыя) — C. Mafuta (Германія).
**21.00** Ралі. ERC.
**21.30** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Пасля твайго адыходу».
**6.15** Дэтэктыў «Высокі бландзін у чорным чаравіку».
**7.40, 10.40, 20.45, 21.50, 1.50, 4.45** «Камедыянты. Лепшае».
**9.00** Камедыя «Дыска».
**11.15** Камедыя «Экспалюбоўнік».
**14.10** Камедыя «Загадана ажаніць».
**16.30** Камедыя «Валацуга».
**17.20** Мюзікл «Джэнтльмены аддаюць перавагу бландзінкам».
**19.20** Камедыя «Закінутыя ў лесе».
**22.10** Камедыя «Нявеста, якая ўцякла».
**0.10** Прыгоды «Прывід у законе».
**3.25** Камедыя «Шэф».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 14.45** «Доктар I...».
**9.00, 18.30, 4.50** Серыял «Забароненае каханне».
**10.30, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.30, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.30, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.00, 20.15** Серыял «Контргульня».
**13.50** «Дом дагары нагамі».
**15.15, 1.30** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.00** Камедыя «Мой лепшы палюбоўнік».
**22.00** Маст. фільм «Цягнік на Юму».
**0.05** Серыял «Каліфрэнія».

### ТБ1000

**5.00** Камедыя «Поўнач у Парыжы».
**6.50** Мюзікл «У рытме сэрца».
**8.30** Камедыя «Юнацтва, якое бунтуе».
**10.05** Драма «Прах Анджэлы».
**12.35** Дэтэктыў «Перакладчыца».
**14.50** Трагікамедыя «Кірмаш ганарыстасці».
**17.15** Драма «Сакавіцкія іды».
**19.00** Драма «Дзённік памяці».
**21.10** Трылер «Слепата».
**23.15** Драма «Небяспечны метад».
**1.00** Меладрама «Спяшайся кахаць».
**2.50** Трылер «Праўда пра Чарлі».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Казка «Прынцэса на гарошыне».
**8.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 3-ДЭ».
**10.00** Драма «Ён, яна і я».
**11.40** Дэтэктыў «Смерць пад ветразем».
**14.00** Трагікамедыя «Неадэкватныя людзі».
**16.10** Баявік «Брыгада: Спадчыннік».
**18.10** Драма «Райскія птушкі».
**20.00** Прыгоды «Ліса Аліса».
**21.45** Баявік «Бой з ценем».
**0.10** Меладрама «Іронія лёсу. Працяг».
**2.10** Меладрама «Летам я аддаю перавагу вяселлю».
**4.00** Драма «Царэвіч Аляксей».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**6.00, 16.00** Рыбы-пачвары.
**7.00** Загадкі каралеўскай кобры.
**8.00, 13.00, 22.00** Дзікі тунец.
**10.00** Суперзбудаванні.
**11.00** Мегазаводы.
**12.00** Золата Юкана.
**15.00** Выратаваны львіцай.
**17.00, 2.00** Паветраныя асы вайны.
**18.00** Турэмныя цяжкасці.
**19.00** Займальная навука.
**20.00, 0.00, 3.00** Космас.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00** Класіка з Паўднёвага пляжа.
**7.50, 12.20** Хлопцы з Юкана.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Адпетыя рыэлтары.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Як уладкаваны Сусвет.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Амерыканскі чопер.
**15.05** Сысці ад пагоні.
**16.00** Пятая перадача.
**17.20, 3.05** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**18.15** Залатая ліхаманка.
**21.00** Пяцёрка лепшых.
**22.00** Будаўніцтва небаскроба «Шард».
**23.00** Пытанні светабудовы.
**0.00, 5.10** Не спрабуйце паўтарыць.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# СУБОТА, 19 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.00** Існасць.
**7.30 Камедыя «Белыя Росы».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 1.50 Серыял «Сваты 3».**
**10.50** «Пра ежу!».
**11.25** Дача.
**12.10** Здароўе.
**12.55** «Пра жыццё, служэнне і ўласны шлях да Бога».
**13.25** Журналісцкае расследаванне.
**14.00** Нашы.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Мірны тур.
**15.45** Даварай і правярай.
**16.20, 2.40** «Вялікая розніца».
**17.30 Меладрама «Самая Прыгожая». 1-я — 4-я, заключная, серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40** Святочнае богаслужэнне на Уваскрэсенне Хрыстова з архікафедральнага касцёла Ісуса Міласэрнага.
**23.40** Святочнае богаслужэнне на Уваскрэсенне Хрыстова з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.
**1.40** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.45 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**8.40, 21.10** Тэлебарометр.
**8.45** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.35** Беларуская кухня.
**10.20** «Два з паловай кухары».
**10.50, 21.45 Серыял «Інтэрны».**
**12.50** Вышэй за дах.
**13.25** Бітва экстрасэнсаў.
**14.30 Камедыя «Мой каханы марсіянін».**
**16.20 Камедыя «Трэзор».**
**18.00** «Імперыя песні».
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** «Суперінтуіцыя. Каханне».
**21.05** КЕНО.
**21.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
**23.45 Меладрама «Джэры Магуаер».**

### БЕЛАРУСЬ 3

